УДК 811. 161. 3’373.4:78

# АНТАНІМІЯ Ў МУЗЫЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

***В. І. Сідарэнка*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Д. А. Карпечкіна***,
канд. філал. навук, дацэнт

У беларускай музычнай тэрміналогіі рэалізуюцца два асноўныя тыпы антаніміі – контрадыкторны і кампліментарны.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Да контрадыкторнага тыпу адносяцца тэрміны, супрацьпастаўленне якіх з'яўляецца вынікам сцвярджэння / адмаўлення ўласцівасці або прыкметы. Як правіла, апазіцыйнасць адносін унутры пар выражаецца праз рэгулярнае выкарыстанне / невыкарыстанне адпаведных прэфіксаў. У межах тэрміналогіі музыкі гэта спецыяльныя намінацыі-субстантывы з фармантамі ***анты-***, ***дыс-***, ***контр-***, ***а-***, ***не-***: *фон – антыфон*, *гармонія – дысгармонія*, *ратацыя – контрратацыя*, *танальнасць – атанальнасць* [1].

Да камплементарных антонімаў уласціва бінарная апазіцыйнасць дэфініцый. Як правіла, камплементарную супрацьпастаўленасць утвараюць відавыя паняцці, якія ўзаемадапаўняюць адна другое да родавага. Гэты тып антомінаў найменш пашыраны ў музычнай тэрміналогіі: *абертоны – унтэртоны* [1]. Так, калі *абертоны* – 'прыгукі, размешчаныя вышэй за асноўны тон, па якім вызначаецца вышыня гуку' [1], то *унтэртоны* – 'тэарэтычна выведзены рад гукаў, які знаходзіцца ніжэй за асноўны тон' [1].

Адносіны антаніміі характэрныя, у першую чаргу, для аднаслоўных тэрмінаў. Полілексемныя тэрміны могуць уваходзіць у антанімічныя пары, як правіла, толькі праз антанімію асобных кампанентаў: *акордавыя гукі – неакордавыя гукі* [1].

Такім чынам, антанімічныя адносіны характэрныя для беларускамоўнай тэрміналогіі музыкі. З прааналізаванага матэрыялу вынікае, што ў беларускай музычнай тэрміналогіі найбольш пашыраны кантрадыкторны тып антаніміі, які звычайна рэалізуецца праз выкарыстанне абмежаванага набору прэфіксаў і нярэдка вызначаецца семантычнай асіметрычнасцю антонімаў, пры якой адзін з тэрмінаў у антанімічнай пары семантычна больш складаны за другі.

**Літаратура**

1. Музычны слоўнік беларуска-рускі. Музыкальный словарь русско-белорусский / аўт.-склад.: Г. Р. Куляшова, Т. Г. Мдывані, Н. А. Юўчанка і інш. ; навук. рэд. : Г. Р. Куляшова, Л. А. Антанюк. – Мінск. : Бел. навука, 1999. – 559 с. : нот. іл.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова